**Литература**

1. The South African Energy Sector Report 2021 // Department of Mineral Resources and Energy, Republic of South Africa. – URL: https://www.energy.gov.za/files/media/explained/2021-South-African-Energy-Sector-Report.pdf (date of access: 13.04.2025).
2. The Carbon Brief Profile: South Africa // Carbon Brief/ Clear on Climate. – URL: https://www.carbonbrief.org/the-carbon-brief-profile-south-africa/ (date of access: 13.04.2025).

## Работнікі прамысловых прадпрыемстваў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX ст.: сацыяльны склад і ўмовы працы

*Прышчэпа М. Д., студ. III к. БДУ,*
*навук. кір. Маскевіч Г. І., канд. гіст. навук, дац.*

У другой палове XIX ст., атрымаўшы стымулюючы імпульс у выглядзе буржуазных рэформ, фабрычна-заводская вытворчасць Беларусі працягнула развівацца, але былі фактары, якія заміналі яе хуткаму росту, у прыватнасці, недахоп працоўных рук і вузкасць унутранага рынку працы.

Першапачаткова ў фабрычна-заводскай вытворчасці выкарыстоўвалася пераважна праца сялян. Гэта было звязана з тым, што пасля адмены прыгоннага права сяляне, якія атрымалі асабістую волю, мелі магчымасць самастойна выбіраць месца працы. На дваранскіх прадпрыемствах прыгонныя амаль нічога не зараблялі, таму пасля атрымання волі масава ішлі на заробкі ў гарады. Такая з’ява, калі сяляне пакідалі працу на зямлі ды йшлі працаваць у больш буйныя населеныя пункты – гарады ці мястэчкі, атрымала назву “адыходніцтва”, а прышлыя ў гарадское асяроддзе сяляне называліся “адыходнікі” [5, с. 43]. Паступовы працэс адрыву сялян ад земляробства і адыход на прамысловыя прадпрыемствы з’явіўся падмуркам фарміравання прамысловага пралетарыяту Беларусі. Фактычна, адыходніцтва фарміравала унутраны рынак працы. Сыходзячы на фабрыкі і заводы, адыходнікі адмаўляліся ад сельскай гаспадаркі і пераўтвараліся ў прамысловых работнікаў. Сувязь з вёскай захоўвалася праз перасылку грошай у валасную ўправу для працягу тэрміну адлучкі. Пры адсутнасці адукацыі ў сялянскіх дзяцей, апошнія ішлі па слядах сваіх бацькоў – працаваць на фабрыкі і заводы. Так, на гарбарным заводзе ў Мазырскім павеце эксплуатаваліся 10-гадовыя дзеці, а на Добрушскай папяровай фабрыцы працавалі 25 дзяцей ва ўзросце ад 12 да 15 гадоў [4, с. 146–147].

Умовы працы на прамысловых прадпрыемствах былі кепскія. Тэхніка бяспекі на прадпрыемствах не выконвалася. Заводскія памяшканні – так

званыя цэхі – знаходзіліся не ў лепшым стане. Часу пад'есці не было, рабочыя сілкаваліся наўпрост на сваім працоўным месцы. Медыцынская дапамога не аказвалася, бальнічных лістоў не давалі. Грашовых кампенсацый за траўмы або страту працаздольнасці не існавала. Колькасць працоўных гадзін залежала ад жадання работадаўцы, таму працаваць маглі і па 18 гадзін у суткі. Фабрычнае заканадаўства пачало афармляцца з 1882 г., але фабрыканты і заводчыкі пастаянна парушалі законы, таму працоўны дзень цягнуўся столькі, колькі таго жадаў гаспадар. У 1885 г. на запалкавых фабрыках беларускіх губерняў рабочыя працавалі прыкладна па 14 гадзін, на суконных – ад 10 да 14 гадзін, на гарбарных, шкляных і чугуналіцейных заводах па 12 гадзін, на лесапільнях і ганчарных заводах – па 11 гадзін, на некаторых броварах – да 16 гадзін [2, с. 76].

Умовы пражывання работнікаў розных прадпрыемстваў адрозніваліся, але ўсё адно не былі задавальняючымі. Большасць прамысловых работнікаў жыла на гарадскіх ускрайках, у так званых рабочых кварталах, якія складаліся з драўляных дамоў і фабрычных баракаў [1, с. 99]. Некаторыя работнікі жылі ў фабрычна-заводскіх памяшканнях. Работнікі даволі часта арэндавалі памяшканне або кут на кароткі тэрмін, пасля сканчэння арэнды прыходзілі новыя людзі. Пакоі, знятыя на нейкі час, мелі антысанітарныя ўмовы, што выклікала распаўсюджанне розных хвароб. Калі становішча было вельмі цяжкае і грошай увогуле не было, то людзі здымалі падвальныя памяшканні (склеп).

Кемлівыя і энергічныя адыходнікі, якія былі незадаволены ўмовамі працы на мясцовых прадпрыемствах, спрабавалі шукаць лепшай долі ў іншых раёнах Расійскай імперыі і за мяжой – у ЗША, Канадзе, Германіі і іншых краінах. Такім чынам, адбываўся адток працоўнай сілы. Эміграцыя беларускіх рабочых у краіны Захаду складала 600–800 тыс. чалавек, а з улікам эміграцыі яўрэяў – 1300 тыс. жыхароў Беларусі [3, с. 125]. Агенты-вярбоўшчыкі таемна перапраўлялі людзей праз парты Германіі. У замежжы прыезджых адыходнікаў мясцовыя прадпрымальнікі разглядалі як нізкааплатны тавар, які не ведаў мовы краіны і таму мог няшчадна эксплуатавацца, таму з задавальненнем бралі мігрантаў на працу. Умовы працы і пражывання за мяжой былі яшчэ горшыя. Калі мігранты вярталіся дадому і зноў прадавалі сябе на працоўным рынку, то пасля такой замежнай «практыкі» патэнцыяльныя работадаўцы разглядалі іх як больш-менш кваліфікаваных рабочых, таму іх праца цанілася вышэй: такому работніку плацілі прыкладна як двум звычайным рабочым. З такой рэтраспектывы міграцыю можна разглядаць у якасці фабрычнай школы.

У другой палове XIX ст. мадэрнізацыйныя працэсы ўплывалі на развіццё прамысловасці, мянялі сацыяльны стан грамадства. Фарміравалася новая культура вытворчасці і новы менталітэт, якія адпавядалі часу – індустрыяльнаму

грамадству. У былых прыгонных павышаўся ўзровень пісьменнасці і самасвядомасці, адначасова рос і духоўны запыт. Прамысловыя рабочыя, былыя сяляне, пазнаёміліся з жыццём гараджан, набылі рознага кшталту новыя звычкі, погляды, перакананні. Іх светапогляд станавіўся больш «гарадскім»: важнае значэнне надавалася працы на прамысловых прадпрыемствах, а сельская гаспадарка для іх паступова адыходзіла на другі план, і з цягам часу такія сяляне пачалі лічыць сябе прамысловымі рабочымі.

**Літаратура**

1. Алексашина, Г. В. Наемные работники в городах Беларуси: состав, правовое и экономическое положение (1890–1913 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Г. В. Алексашина. – Минск, 2019. – 222 л.
2. Бурачонак, А. В. Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводской вытворчасці Беларусі (1861–1914 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Бурачонак. – Мінск, 2012. – 151 л.
3. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) : дыс. … док. гіст. навук : 07.00.02 / А. Г. Каханоўскі. – Мінск, 2014. – 340 л.
4. Липинский, Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.) / Л. П. Липинский. – Минск : Наука и техника, 1971. – 252 с.
5. Панютич, В. П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии (1861–1914 гг.) / В. П. Панютич. – Минск : Издательство «Наука и техника», 1969. – 192 с.

# Шлосберг Яфім Паўлавіч: навуковая ніва і доля

*Савасцюк Ц. С., студ. II к. БДУ,*
*навук. кір. праф. Яноўскі А. А., канд. гіст. навук*

Першая палова ХХ стагоддзя для Беларусі характарызуецца цяжкасцю з-за праходзячых важных сусветных і рэгіянальных падзей. Жыццё змянілася ва ўсяго насельніцтва, у тым ліку ў навуковым асяроддзі. Адзін з людзей, што сваёй біяграфіяй дэманструе гэты цяжкі час з нечаканымі зменамі, – Шлосберг Яфім Паўлавіч.

Будучы вучоны нарадзіўся ў Вільні, у 1928 г. скончыў педагагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і працягваў займацца навукай. З 1937 г. займаў пасаду загадчыка кафедры гісторыі ў Мінскім вышэйшым педагагічным інстытуце, дзе працаваў да самага пачатку Вялікай Айчынная вайны [1, с. 345–346]. Некаторыя крыніцы акцэнтуюць увагу на нацыянальнасці Яфіма Паўлавіча – яўрэй [2].

23 чэрвеня 1941 г., знаходзячыся ў Мінску, ён быў прызваны ў савецкую армію, ужо паспеўшы стаць кандыдатам гістарычных навук. Змагаўся за айчыну